**Інструкцыя для трансферных і транзітных пасажыраў, якія прылятаюць з Расійскай Федэрацыі або Казахстана**

**З Расійскай Федэрацыі**

Для пасажыраў, якія прыбываюць у Нацыянальны аэрапорт Мінск рэйсам з аэрапортаў Расійскай Федэрацыі, пашпартны і мытны кантроль адсутнічае.

Трансферныя пасажыры, маючыя пасадачныя талоны на далейшы ўчастак палёту міжнароднымі рэйсамі, багаж якіх аформлены да канцавога пункта палёту, выходзяць з зоны прылёту рэйсаў з РФ (1-ы паверх сектар №5-6) і накіроўваюцца па паказальніках у сектар №1-4 (міжнародныя рэйсы). Далей, выкарыстоўваючы ліфт або эскалатар, пасажыры рухаюцца на 3-і паверх у залу афармлення пасажыраў на вылет. Пасажыры, якія маюць пасадачныя талоны, накіроўваюцца ў зону перадпалётнага надгляду, мытнага і пашпартнага кантролю і далей у сектар вылету рэйса.

Калі багаж трансфернага пасажыра быў аформлены да Мінска, пасажыру належыць атрымаць багаж у зоне выдачы багажу на прылёце, звярнуцца на стойку рэгістрацыі і прайсці афармленне на рэйс ва ўстаноўленым парадку.

**З Арменіі і Казахстана**

Гэтыя пасажыры з’яўляюцца пасажырамі міжнародных рэйсаў з адпаведнымі патрабаваннямі афармлення.

Грамадзяне Арменіі і Казахстана, для якіх не патрабуецца транзітная віза Рэспублікі Беларусь і якія маюць пасадачны талон на свой рэйс (багаж аформлены да канцавога пункта пасадкі), пасля праходжання пашпартнага кантролю на прылёт могуць пакінуць зону прылёту. Пасля аб’яўлення пасадкі на рэйс гэтыя пасажыры ідуць у пункт перадпалётнага надгляду, праходзяць мытны і пашпартны кантроль на вылет і далей накіроўваюцца ў сектар пасадкі.

Пры жаданні прайсці адразу ў зону вылету, пасажыры з зоны прылёту па лесвічным пралёце або выкарыстоўваючы ліфт, падымаюцца на ўзровень 2-га паверха, дзе ў зоне абслугоўвання трансферных пасажыраў праходзяць: кантроль праязных дакументаў, перадпалётны надгляд, мытны кантроль на вылет і далей накіроўваюцца на 3-і паверх у сектар пасадкі.